■ Спорт-тайм

# З АЎСТРЫІ Ў ФРАНЦЫЮ, АЛЕ БЕЗ ЛІДАРА

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі другога этапу Кубка свету па біятлоне, выступленне мінскіх «Цмокаў» у Адзінай лізе ВТБ і «Дынама» ў Кантынентальнай хакейнай лізе.**

**1.** ***Завяршыўся другі этап Кубка свету па біятлоне.*** У Хохфільцэне Дар'я Домрачава прапусціць згаданы кубкавы этап: на гэты час у спартсменкі запланаваны трэніровачны збор.




Домрачава двойчы ўздымалася на п'едэстал — у спрынце беларуска была першая, а ў гонцы праследавання трэцяя. Этап завяршыўся эстафетамі, дзе нашы дзяўчаты сталі 7-і, а мужчыны не змаглі фінішаваць, таму што былі дыскваліфікаваныя з-за адставання на круг.

Такім чынам, Надзея Скардзіна займае 7-е месца ў агульным заліку, Дар'я Домрачава паднялася на 12-ю пазіцыю, Ірына Крыўко — 31-я, Надзея Пісарава — 59-я, Дар'я Юркевіч — 69-я. З мужчын толькі Раман Ялётнаў мае заліковыя балы і размяшчаецца на 58-й пазіцыі кубкавага заліку.

Трэці этап Кубка свету з 14 па 17 снежня прыме французскі Ансі. У яго праграме спрынты, гонкі праследавання і мас-старты.

**2.** ***Мінскія «Цмокі» перамаглі баскетбалістаў талінскага «Калева» з лікам 87:84 у дамашнім паядынку Адзінай лігі ВТБ.*** Самым выніковым у складзе пераможцаў стаў Аляксандр Кудраўцаў, які набраў 23 ачкі.

Гэта чацвёртая вікторыя падапечных Аляксандра Круцікава ў дзевяці матчах рэгулярнага чэмпіянату Адзінай лігі ВТБ, цяпер яны займаюць 6-е месца сярод 13 удзельнікаў турніру. Лідзіруе дзеючы пераможца маскоўскі ЦСКА. Свой наступны матч банкаўскага турніру «цмокі» правядуць 7 студзеня 2018 года на паркеце «Мінск-Арэны» супраць «Зеніта».

Перад гэтым «Цмокі» 20 снежня таксама ў сябе дома згуляюць з дацкім клубам «Бакен Беарз» у стартавым паядынку другога групавога этапу розыгрышу Кубка ФІБА-Еўропа.

**3.** ***Беларускія параалімпійцы заваявалі 20 медалёў (11 залатых, 7 сярэбраных і 2 бронзавыя) на чэмпіянаце свету па плаванні, які завяршыўся ў Мехіка.*** Сем узнагарод на рахунку 11-разовага чэмпіёна Параалімпіяды Ігара Бокага.

У медальным заліку па колькасці залатых узнагарод зборная Беларусі заняла пятае месца. На папярэднім чэмпіянаце свету ў 2015 годзе ў Глазга беларускія параалімпійцы заваявалі дзевяць узнагарод і занялі дзявятае месца ў медальным заліку.

**4.** ***Гандбалісты БГК імя Мяшкова перайгралі славацкі «Татран» у паядынку SEHA-лігі 32:26.*** Прайграўшы першы тайм, у другім яны выглядалі значна больш пераканаўча, дабіўшыся выніковай перавагі ў шэсць мячоў.

— Мы нядрэнна згулялі стартавы адрэзак. Потым пайшлі страты, дзесьці бую правал. Лічу, нядрэнна згулялі ў абароне. Ведалі, што ў чацвер «Татран» правеў матч і прыязджае да нас ва ўсечаным складзе. Таму стаўка была на ратацыю і хуткасць. Абыгралі саперніка, які прэтэндуе на «фінал чатырох», — пракаментаваў паядынак **галоўны трэнер «мяшкоўцаў» Сяргей БЯБЕШКА.**

**5.** ***Мінскае хакейнае «Дынама» пацярпела паражэнне ад самай слабай каманды Заходняй канферэнцыі рыжскага «Дынама» 1:3.*** Пасля аднаго з самых няўдалых выездаў гэтага сезона «зубры» вярнуліся дадому і працягнулі серыю паражэнняў у чэмпіянаце КХЛ ужо да 4 паядынкаў.

У турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі пасля гэтага паядынку мінскае «Дынама» з 50 баламі пасля 40 матчаў займае 10-е месца сярод 13 каманд. Пры гэтым адставанне ад мяжы плэй-оф складае ўжо 10 ачкоў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*




# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.19 | 16.47 | 7.28 |
| Віцебск — | 9.16 | 16.29 | 7.13 |
| Магілёў — | 9.09 | 16.37 | 7.28 |
| Гомель — | 8.57 | 16.42 | 7.45 |
| Гродна — | 9.33 | 17.04 | 7.31 |
| Брэст — | 9.25 | 17.13 | 7.48 |

## Месяц

*Апошняя квадра 10 снежня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр. Парамона.*
*К. Адэлаіды, Жанны, Аляксандра, Кандрата.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**12 СНЕЖНЯ**

**1901** год — у Вялікабрытаніі заснавана першая ў свеце Асацыяцыя настольнага тэніса. Каля вытокаў гэтага віду спорту стаялі брытанскія вайскоўцы, якія неслі службу ў Індыі і Паўднёвай Афрыцы. Замест ракетак яны выкарыстоўвалі кардонныя вечкі ад цыгарэтных каробак, мячыкамі служылі абрэзаныя бутэлечныя коркі, а замест сеткі на стол выкладваліся кнігі. Гісторыя паходжання назвы «пінг-понг» (нагадвае гук удару мячыка аб стол) дакладна невядома. Ёсць меркаванне, што яна было ўведзена ва ўжытак у 1901 годзе кампаніяй «Джон Жак і сыны». Гэтая фірма афіцыйна зарэгістравала назву і перадала ўсе правы на выкарыстанне гандлёвай маркі амерыканскай фірме «Паркер бразерс», якая адразу ж наладзіла вытворчасць спартыўнага інвентару для гульні.

**1918** год — нарадзіўся (в. Гайшын Слаўгарадскага раёна) Кастусь Кірэенка, беларускі паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1945—1962 гадах працаваў у часопісе «Беларусь», з 1962 года — галоўны рэдактар часопіса «Бярозка», у 1972—1986-м — часопіса «Полымя». Аўтар зборнікаў «Песня навальніцы», «Мая рэспубліка», твораў для дзяцей (зборнікі «Зялёнае рэха», «Вясна-красна») і іншых. Некаторыя вершы К. Кірэенкі пакладзены на музыку. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1988 годзе.

**1928** год — нарадзіўся Чынгіз Айтматаў, народны пісьменнік Кыргызстана, дыпламат, акадэмік АН Кыргызскай Рэспублікі. Аўтар аповесцяў «Джаміля», «Белы параход», раманаў «Плаха», «Калі падаюць горы» і іншых твораў. Памёр у 2008 годзе.

**1979** год — Палітбюро ЦК КПСС афіцыйна прыняло рашэнне аб уводзе савецкіх войскаў у Афганістан. 8 кастрычніка 1979 года быў забіты Нур Мухамад Тараці — заснавальнік Народна-дэмакратычнай партыі Афганістана і першы кіраўнік Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан. Да ўлады ў краіне прыйшоў Хафізула Амін, які пры ўсёй сваёй лаяльнасці да Масквы меў уласнае меркаванне ў пытаннях далейшага будаўніцтва афганскага грамадства. Гэтыя падзеі былі расцэнены ў Крамлі як контррэвалюцыйны пераварот. Было вырашана падтрымаць прыхільнікаў канцэпцыі сацыялізму ў Афганістане, якія прыйшлі да ўлады ў выніку Красавіцкай рэвалюцыі 1978 года і якія сутыкнуліся з магутнай апазіцыяй сваёй сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай стратэгіі. На міжнародным узроўні было заяўлена пра тое, што СССР кіруецца прынцыпамі «пралетарскага інтэрнацыяналізму», і ўжо 25 снежня ў Афганістан увайшла 40-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Юрыя Тухарынава.



**Было сказана**

**Оскар УАЙЛЬД,**
**англійскі паэт, драматург, літаратурны крытык:**
*«Жыццё дорыць чалавеку ў лепшым выпадку адно-адзінае непаўторнае імгненне, і сакрэт шчасця ў тым, каб гэтае імгненне паўтаралася як мага часцей».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Тэрмінова!**
**Шукаю работу дэгустатара шашлыка, па сумяшчальніцтве магу дэгуставаць каўбасы, сыр, ікру, гарэлку, піва і інш.**
**P.S. Магчымы сямейны брыгадны падрад.**

Муж — жонцы.
— Дарагая! Я вось тут прачытаў, што падчас сексу мужчына спальвае столькі ж калорый, як быццам ён прабег 9 кіламетраў!
— Ды ты ў мяне чэмпіён! 9 кіламетраў за 3 хвіліны!

**Людзі лічаць мяне добрым чалавекам. Яны памыляюцца. Проста я ўвесь час не высыпаюся і мне не хапае сіл, каб іх біць.**

Дзеці — кветкі жыцця :)
Бацька прывёз 5-гадовага сына на прышчэпку ў паліклініку. Сядзяць у кабінеце, медсястра набірае шпрыц. Раптам дзіця паварочваецца да таты:
— Я цябе пакуль у машыне пачакаю, добра?




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4733.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 11 снежня 2017 года.